# НОВЫЯ МЕДЫЯТЭХНАЛОГІІ І ІНАВАЦЫЙНЫЯ МЕТОДЫКІ ПРЭЗЕНТАЦЫІ І ІНТЭРПРЭТАЦЫІ МУЗЕЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ (з практыкі музеяў замежжа)

**І. Б. Лапцёнак,** *начальнік аддзела навукова-метадычнага забеспячэння развіцця музейнай дзейнасці Інстытута культуры Беларусі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На сучасным этапе развіцця грамадства назіраецца глабальная інфарматызацыя сацыяльнай прасторы, якая адбываецца ва ўсіх сферах культуры і адлюстроўвае пэўную тэндэнцыю: узмацненне камунікатыўных сувязей праз развіццё інфармацыйных тэхналогій. Іх укараненне ў музейную прастору мадэрнізуе формы і метады музейнага экспанавання і садзейнічае пашырэнню межаў віртуальнай музейнай прасторы.

Сведчаць аб гэтым і вынікі Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Культурная спадчына і інфармацыйныя тэхналогіі на постсавецкай прасторы. АДІТ-15» (Мінск–Мір–Нясвіж, 10–14 мая 2011 г.), арганізаванай Міністэрствам культуры з удзелам партнёрства «Аўтаматызацыя дзейнасці музеяў і інфармацыйныя тэхналогіі» (Расійская Федэрацыя). На базе вядучых музеяў Беларусі адбыліся 14 пасяджэнняў, прысвечаных развіццю камп’ютарных тэхналогій у дзейнасці музеяў, архіваў і бібліятэк. У канферэнцыі прынялі ўдзел спецыялісты розных профілей і навуковай спецыялізацыі музеяў Расійскай Федэрацыі, Казахстана, Кіргізіі, Татарстана і іншых краін: Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі, Дзяржаўнага Эрмітажа, Дзяржаўнага гісторыка-культурнага запаведніка «Маскоўскі Крэмль», Дзяржаўнага гістарычнага музея, Дзяржаўнага музея выяўленчых мастацтваў імя А. С. Пушкіна, Музея антрапалогіі і этнаграфіі (Кунсткамера), Дзяржаўнага гісторыка-архітэктурнага і этнаграфічнага музея-запаведніка «Кіжы», Музея Першага Прэзідэнта Рэспублікі Казахстан і інш. Правядзенне канферэнцыі выявіла неабходнасць пашырэння кантактаў паміж музеямі Рэспублікі Беларусь і замежжа, развіцця сумеснай партнёрскай дзейнасці ў сферы інфарматызацыі, стварэння і належнага фінансавання музейных камп’ютарных праектаў і праграм, арганізацыі музейных

рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцый і семінараў з мэтай азнаямлення з апошнімі распрацоўкамі ў галіне інфармацыйных тэхналогій і абмену вопытам.

Конкурсная праграма Міжнароднага камп’ютарнага фестывалю, арганізаванага Інстытутам культуры Беларусі сумесна з партнёрствам «Культурная спадчына ў лічбавых тэхналогіях» (Расійская Федэрацыя), праходзіла ў шасці намінацыях. Экспертнай камісіяй былі разгледжаны 17 электронных праектаў беларускіх музеяў, 10 з іх былі адабраны для шырокага грамадскага абмеркавання, 5 праектаў былі адзначаны дыпломамі пераможцаў: сайты Гомельскага палацава-паркавага ансамбля і Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, праекты «Электронны каталог выяў Казьянкаўскага скарбу арабскіх куфічных дырхамаў са збору Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка» і «З гісторыі даваенных збораў… Дакументы і фатаграфіі» Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, мультымедыйнае выданне «Сымон-музыка» Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.

Фестываль выявіў розны ўзровень камп’ютарных прадуктаў беларускіх музеяў, вызначыў шэраг праблем, у вырашэнні якіх неабходна стварэнне адпаведных умоў для работы музейных спецыялістаў: арганізацыя стацыянарных працоўных месцаў для адміністратараў музейнай сеткі і інжынераў-праграмістаў у музеях, вылучэнне дадатковых сродкаў не толькі на навучанне камп’ютарнай грамаце музейных супрацоўнікаў, але і на іх адукацыю ў галіне распрацоўкі музейных мультымедыя- і інтэрнэт-праектаў, у тым ліку за мяжой, стварэнне агульнай сістэмы стымулявання творчай ініцыятывы.

Сусветны ўзровень развіцця інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій быў шырока прадэманстраваны падчас правядзення Міжнароднага фестывалю музеяў «Інтэрмузей–2011» (РФ, г. Масква). На секцыі «Мадэрнізацыя вядучых музеяў свету: новае бачанне, новая форма» былі прадстаўлены шэсць музеяў, сярод якіх Музей навукі, Музей Галілеа, Алімпійскі музей Сеула і інш. Асноўная ідэя стварэння музея будучыні – арганізацыя інтэрактыўнай музейнай прасторы для абуджэння ў наведвальніка цікавасці, з дэманстрацыяй разнастайных эксперыментаў і адкрыццяў, стварэння шырокай пляцоўкі як для спецыялістаў, так і разнастайнага кола наведвальнікаў. Новыя тэндэнцыі ў музейнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

справе, якія актыўна развіваюцца еўрапейскімі музеямі, – змена прыярытэтаў і прэзентацыя музея як сацыяльнай, адкрытай для дыялога ўстановы, даступнасць музейных калекцый, новыя тэхналогіі работы з наведвальнікамі.

На секцыі «Прэзентацыі міжнародных музейных конкурсаў і іх лаўрэатаў 2010 года» ў дакладзе «Europa Nostra (прэмія Europa Nostra і Савета Еўропы за дасягненні ў справе захавання і папулярызацыі культурнай спадчыны)» былі высока ацэнены праекты Музея Матра (Венгрыя), Музея Ван Гога (Амстэрдам), Нацыянальнага музея Румыніі.

Конкурс Еўрапейскага музейнага форуму быў прадстаўлены на прэзентацыі актуальных музейных праектаў «Акно ў свет». Мэта яго правядзення – падтрымка інавацыйных даследаванняў, выяўленне і распаўсюджанне лепшых практык у музейнай справе Еўропы. Асноўныя крытэрыі адбору праектаў: адпаведнасць прафесійным стандартам, інавацыйны патэнцыял, служэнне грамадству, развіццё дыялога паміж культурамі, выкарыстанне сучасных тэхналогій у музейнай дзейнасці, прадстаўленне нацыянальнай культуры ў агульнаеўрапейскай перспектыве. Пераможцам конкурсу Еўрапейскага музейнага форуму стаў Ozeaneum (Германія). Асноўная ідэя праекта пераможцы – інтэрпрэтаваць з дапамогай навуковых даных для шырокай аўдыторыі выразна, інтэрактыўна і даступна, у атмасферы творчасці. Асабліва ўражваюць у праекце Ozeaneum тэхналагічныя магчымасці, яскравае імкненне да дыялогу і актуалізацыі культурнай спадчыны разнастайнымі сродкамі.

Адметныя методыкі музейнай прэзентацыі і інтэрпрэтацыі былі адзначаны ў галіне музейнага дызайну. Шырокі праект рэканструкцыі прадстаўлены Нацыянальным музеем Шатландыі. На думку экспертаў, эфектыўнасці развіцця музея ў значнай ступені спрыялі пашырэнне музейнай інфраструктуры, трансфармацыя музея – адкрыццё 16 галерэй, навуковага цэнтра, музейнай крамы, інтэрактыўных пляцовак для работы з дзіцячай аудыторыяй, рэкрэацыйнай зоны для сямейнага адпачынку. Адметным прадметам паказу стаў Музей музычных інструментаў у Дубліне (Ірландыя) са своеасаблівымі дызайнерскімі прыёмамі і шырокім выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій у экспазіцыі. Прыём ажыўлення экспаната быў прадэманстраваны на прыкладзе Шатландскага музея ў Глазга. Акцэнт быў зроблены на інтэрактыўных элементах у экспазіцыі Музея Р. Бёрнса: мастацкія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вобразы, персанажы «выходзяць» з кніг паэта, агучваюцца рукапісы і інш. Дадатковы фактар прыцягнення наведвальнікаў да музея – карыкатура на памяць, стварэнне сілуэтаў і іх устаноўка на мабільны тэлефон.

Кіраўнік аддзела арганізацыі мерапрыемстваў Музея дызайну і прыкладных мастацтваў Röhsska (Швецыя) адзначае неабходнасць стварэння ў музеі актуальнай прасторы сэнсавых паралелей розных культурных эпох і з’яў, заснаваных у тым ліку і на кантрасце: прэзентацыя і інтэрпрэтацыя калекцыі з паперы, прадметы сучаснага прамысловага дызайну і музейныя прадметы, сучасны арт-аб’ект у інтэр’еры мінулых стагоддзяў, выстава як вобразнае ўвасабленне тэатральнай сцэны.

Адметным прыкладам сучаснай экспазіцыі, выкананай з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій, з’яўляецца экспазіцыя Дома-музея М. В. Гогаля (2009, г. Масква, мастак Л. Азернікаў). Яна пабудавана ў адпаведнасці з арыгінальнай канцэпцыяй, на аснове якой былі арганізаваны і своеасаблівае размяшчэнне залаў, і адметнае асвятленне, і акустыка.

У кожным з пакояў музея прыцягвае ўвагу адметны арт-аб’ект, які з’яўляецца акцэнтам экспазіцыйнай залы: у пярэднім пакоі – куфар падарожніка, у гасцёўні – камін, у кабінеце – канторка, у зале «Рэвізора» – крэсла, у пакоі памяці – пасмяротная маска Гогаля. Арт-аб’ект прадстаўляе сімвалічную інсталяцыю, якая выяўляе душу мемарыяльнай прасторы, ствараючы адметны вобраз. Так, куфар уяўляе сабой сімвал дарогі, камін – сімвал трагедыі, гарэння душы, абнаўлення, канторка – увасабленне творчасці,ператварэння. Праз стварэнне крыштальных інсталяцый з відэапрэзентацыямі і гукавымі эфектамі арт-аб’екты ажываюць. Пашырэнне музейнай прасторы за кошт выкарыстання сучасных тэхнічных сродкаў дазваляе дасягнуць эфекту прысутнасці ў свеце персанажаў Гогаля. У камунікатыўны тэкст экспазіцыі ўведзены такія метады інтэрпрэтацыі музейнага прадмета, якія адкрываюць у ім другі сэнс і незвычайныя спосабы прэзентацыі.

Згодна з музейным сцэнарыем, у правай палове дома наведвальнік праходзіць шлях Гогаля-пісьменніка, у левай – Гогаля, які чытае свае творы. Зала, прысвечаная яго творчасці, рэзка адрозніваецца ад мемарыяльнай прасторы жылых пакояў. Праз своеасаблівасць васьмі арак увасоблены этапы творчага руху пісьменніка. Аб’ёмна-прасторавыя інсталяцыі выяўляюць персанажаў гогалеўскіх твораў і разам з насценнымі банерамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

служаць фонам, які значна ўзмацняе ўспрыманне сапраўдных музейных прадметаў – графічных і жывапісных ілюстрацый да твораў Гогаля, фотатыпій ранніх пастановак гогалеўскіх твораў, пано з іканаграфіяй пісьменніка.

Іншую методыку інтэрпрэтацыі мемарыяльнай прасторы падае Літаратурна-мемарыяльны музей М. Булгакава «Дом Турбіных». За аснову рэканструкцыі дома-музея ўзяты прынцып арыгінальнасці (мемарыяльнасці) прадметаў. Праведзена навуковая рэканструкцыя будынка праз вывучэнне матэрыялаў дзяржаўных і прыватных архіваў. Захаваны фундамент і сцены дома, паркет, частка лесвіцы, узноўлена тагачасная планіроўка. Аўтары адмовіліся ад метаду тыпалогіі, характэрнага пры стварэнні музея Гогаля. Былі адшуканы арыгінальныя асабістыя рэчы пісьменніка і яго сям'і, якія дапаўняюцца рэчаіснасцю, пабудаванай на аснове мастацкага твора. Экспазіцыя валодае мнагасэнсавым зместам, які ствараецца праз адметнае святлаколеравае рашэнне. За кошт яго экспазіцыя з'яўляецца двухслойнай: у музеі Булгакава адначасова на адной плошчы жывуць дзве сям'і – самога пісьменніка і яго літаратурных герояў. Адметная інтэрпрэтацыя ўвасоблена на працягу ўсяго экспазіцыйнага маршруту вылучэннем кантрасных колераў: мемарыяльная мэбля – у сваім арыгінальным цёмным колеры, другая частка экспазіцыі – жыццё мастацкага твора – у белым. Жыццё і творчасць, рэчаіснасць і містыка ўдала пераплятаюцца і дапаўняюцца.

Стварэнне экспазіцый, у якіх музейная прастора з'яўляецца мастацкім аб'ектам, пляцоўкай адкрытай дыскусіі, з шырокім дыяпазонам мастацкіх рэферэнцый, з выкарыстаннем мастацтва відэаарт, – новая плынь развіцця музейнага дызайну ў Расіі і іншых краінах замежжа, якая карыстаецца вялікім поспехам у наведвальнікаў. Сучасныя інфармацыйна-камунікатыўныя (медыятэхналогіі), такія як відэа, камп'ютарныя і мультымедыйныя, тэхналогіі, інтэрнэт шырока ўвайшлі ў практыку музеяў замежжа. Гэта ў тым ліку і тэхналогіі адкрытага захоўвання музейных фондаў, культурна-адукацыйныя праекты і інш. Так, у Міхайлаўскім інжынерным замку Рускага музея працуе ўнікальны экспазіцыйны праект, заснаваны на медыятэхналогіях, – «Адкрыты фонд скульптуры XX ст.». У яго ўключана каля 200 лепшых твораў айчыннай пластыкі XX ст., якія не ўвайшлі ў пастаянную экспазіцыю музея. Сістэма кіравання экспазіцыяй, у тым ліку агульным і акцэнтным асвятленнем у зале, адрасным пад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

свечваннем вітрын, паварочваннем платформ подыума, інтэгравана з мультымедыйным праграмным забеспячэннем. Таксама былі рэалізаваны сістэмы агучвання, відэапраекцыя на экран з пераменнай празрыстасцю. Адметнай формай прэзентацыі і інтэрпрэтацыі музейных прадметаў стала Міжнародная выставачна-дыскусійная платформа «Музейны гід», арганізаваная Дабрачынным фондам Патаніна і Асацыяцыяй менеджараў культуры. Гэта адкрыты фестываль, які прадстаўляе музей як актуальны сучасны культурны цэнтр, здольны прафесійна інтэрпрэтаваць спадчыну і эфектыўна карыстацца найноўшымі тэхналогіямі.

Аналіз замежнай практыкі сведчыць: сучасны музей павінен быць не толькі захавальнікам мемарыяльных прадметаў, але і своеасаблівай эксперыментальнай лабараторыяй, што працуе на выкананне шырокіх сацыяльных і адукацыйных задач, эфектыўнае прымяненне сучасных інфармацыйных і медыятэхналогій, праз якія музейныя аб’екты ажываюць, ствараючы адметную культурную прастору, прывабную для наведвальніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ